**В.П. Скок,**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
загадчык кафедры германа-раманскага мовазнаўства БДПУ

**Амерыканская зона акупацыі Германіі:**
**адміністрацыя і кіраванне. 1945-1949 гг.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5 чэрвеня 1945 г. паміж урадамі ЗША, СССР, Велікабрытаніяй і Францыяй было падпісана пагадненне аб зонах акупацыі Германіі, дзе, у прыватнасці, указвалася: “Германія ў межах, існаваўшых на 31 снежня 1937 г., будзе падзелена дзеля мэты акупацыі на чатыры зоны, па адной з якіх будзе адведзена кожнай з чатырох дзяржаў, а іменна: усходняя зона – Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, паўночна-заходняя зона – Злучанаму Каралеўству, паўднева-заходняя – Злучаным Штатам Амерыкі і паўднёвая зона – Французскай Рэспубліцы. Акупацыйныя сілы ў кожнай зоне падпарадкоўваюцца галоўнакамандуючаму, прызначаннаму адпаведнай дзяржавай... Раён “Вялікага Берліна” займаецца ўзброеннымі сіламі кожнай з чатырох дзяржаў. Дзеля сумеснага кіравання ім ствараецца міжсаюзніцкая камендатура ў складзе чатырох камендантаў, прызначаемых адпаведнымі галоўнакамандуючымі” [1, с. 50]. На Патсдамскай канферэнцыі (17 ліпеня – 2 жніўня 1945 г.) была канчаткова ўрэгулявана сістэма сумеснага кіравання Германіяй чатырма акупіруючымі дзяржавамі.

З утварэннем акупацыйных зон узнікла новае рэгіянальнае дзяленне Германіі. Паколькі ўсе саюзнікі мелі намер паслабіць у будучай Германіі цэнтральную ўладу, першапачаткова важнымі палітычнымі адзінкамі сталі землі. Занальныя межы ў першыя гады акупацыі выконвалі ролю дзяржаўных.

Амерыканская акупацыйная зона займала паўднева-заходнюю Германію з тэрыторыяй 107,5 тыс.км.кв. (30% тэрыторыі краіны) і насельніцтвам 17,255 тыс.чал. [2, p. 191]. У склад амерыканскай зоны

уваходзілі: Баварыя, Гесэн, паўночныя часткі Бадэна і Вюртэмберга, а таксама горад Брэмен.

Амерыканская ваенная акупацыя Германіі працягвалася чатыры гады: ад капітуляцыі германскага Рэйха ў маі 1945 г. да ратыфікацыі Асноўнага закону ў верасні 1949 г. Да ліпеня 1945 г. функцыі акупацыйнай адміністрацыі на тэрыторыі Германіі выконваў Вярхоўны штаб экспедыцыйных сіл у Еўропе (**S**upreme **H**eadquarters, **A**llied **E**xpeditionary **F**orce), на роспуску якога настойвалі ЗША. 13 ліпеня 1945 г. амерыканская зона акупацыі, анклаў Брэмен і амерыканскі сектар Берліна былі перададзены пад камандаванне ЮСФЕТ (**U**nited **S**tates **F**orces **E**uropean **T**heater — амерыканскія ўзброенныя сілы на еўрапейскім тэатры ваенных дзеянняў) са штабам у Франкфурце. Непасрэдна функцыі ваеннага кіравання былі таксама ў веданні ЮСФЕТ. Усе аспекты, што датычыліся нямецкай адміністрацыі, падрабязна разглядаліся ваенным "кіраўніцтвам" ЗША ў Германіі, якое ў студзені 1946 г. было асобна сфарміравана як арганізацыя ОМГУС (**O**ccupation **M**ilitary **G**overnment of the **US**A — амерыканская ваенная адміністрацыя ў Германіі), са штабам у Берліне [3, p. 11]. ЮСФЕТ захоўваў юрысдыкцыю толькі ў пытаннях звязанных з раззбраеннем, дэмілітарызацыяй, бяспекай і праблемай перамяшчонных асоб, гэта значыць са справамі, якія не датычыліся адміністратыўнага кантролю ў Германіі. ОМГУС здзяйсняў агульнае назіранне над усімі ўнутраннымі пытаннямі, што дытычыліся Германіі, усе больш абапіраючыся на дапамогу нямецкіх адміністратыўных служб і персаналу. І тым не менш, ОМГУС адказваў за правядзенне палітыкі ЗША, абумоўленнай адпаведнымі ўрадавымі органамі ў Вашынгтоне.

У трох заходніх зонах галоўнакіруючы акупацыйнай адміністрацыі называўся "ваенным губернатарам". Фармальна ім з'яўляўся галоўнакамандуючы групай акупацыйных войск у Германіі, але на практыцы мелі месца існаваўшыя адхіленні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Узначальваў амерыканскую ваенную адміністрацыю з мая па лістапад 1945 г. генерал арміі Дуайт Эйзенхауэр (ен жа галоўнакамандуючы). Пасля яго прыемнікамі былі са снежня 1945 г. па сакавік 1947 г. генерал арміі Джозэф Макнэрні, з красавіка 1947 г. па чэрвень 1949 г. генерал-лейтэнант Люцыус Клей (пазней – генерал арміі), з чэрвеня 1949 г. па 1950 г. – Джон Маклой.

Практычна з самага пачатку акупацыйную адміністрацыю зоны ўзначальваў Люцыус Клей (з красавіка 1945 г. – намеснік галоўнакіруючага, з красавіка 1947 г. – галава амерыканскай акупацыйнай адміністрацыі Германіі), штаб якога знаходзіўся ў Берліне. У сваю чаргу, Л. Клей не быў арганізацыйна звязаны з кіраўніцтвам амерыканскімі акупацыйнымі вайскамі ў Германіі. Намеснікі галоўнакіруючых гэтых войск – камандуючы 3-й арміей і камандуючы авіацыяй групы войск у Германіі – не ўзгаднялі сваіх распараджэнняў з намеснікам галоўнакіруючага, фактычным кіраўніком акупацыйнай адміністрацыі. Гэта тлумачыцца тым, што ў амерыканскай (як і ў савецкай) зоне, вышэйшая адміністратыўная ўлада сумяшчалася з ваенным кіраваннем і знаходзілася ў руках камандзіраў злучэнняў. Так, камандуючы арміяй быў адначасова кіраўніком ваеннай адміністрацыі ў раёне дыслакацыі яго войску. Зыходзячы з гэтага, амерыканская зона была падзелена на заходні (7-я армія) і ўсходні (3-я армія) акругі. Камандуючыя 7-й арміяй генерал-лейтэнант Дж. Кейс і 3-й арміяй генерал-лейтэнант Л. Трэскот былі кіраўнікамі ваенных адміністрацый адпаведных акругоў.

Да жніўня 1945 г. гэты прынцып распаўсюджваўся і на карпусы. Напрыклад, камандзір 23-га армейскага корпусу ЗША кіраваў ваеннай адміністрацыяй Грос-Гесэна, камандзір 12-га армейскага корпусу – Ніжняй Баварыяй і Верхнім Пфальцам.

Такое становішча стварала цяжкасці ў правядзенні акупацыйнай палітыкі ЗША ў Германіі. З 1 студзеня 1946 г. кіраўнікі ўпраўленняў ваеннай адміністрацыі падпарадкоўваліся непасрэдна галоўнакамандуючаму амерыканскімі войскамі на Еўрапейскім тэатры ваенных дзеянняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кіраўніцтва акупацыйнымі войскамі і акупацыйнай адміністрацыяй было засяроджана ў адных руках з прызначэннем Л. Клея і галоўнакамандуючым і ваенным губернатарам. З легкай рукі ўплывовага амерыканскага публіцыста У. Ліпмана Л. Клея называлі “праконсулам”. Гэта быў чалавек вялікага інтэлекта, позіркаў і дзеянняў, які з’явіўся архітэктарам нямецкай грамадзянскай адміністрацыі. Амерыканскі гісторык Д. Мідлетан у сваей працы “Барацьба за Германію” сцвярджае, што “да сканчэння тэрміну паўнамоцтваў, імя Клея было сінанімічна палітыцы ЗША ў Германіі” [4, p. 127].

Што датыцыцца непасрэдна кіруючага складу амерыканскай акупацыйнай адміністрацыі, то ен быў наступным. Палітычным саветнікам адміністрацыі ЗША ў Заходняй Германіі прызначылі Роберта Мэрфі. Р. Мэрфі – прафесійны дыпламат з вялікім вопытам працы, здольны непрадузята судзіць аб справах і людзях, меў прэстыж, валодаў падтрымкай у колах Ватыкана і дамагаўся сваей мэты любымі сродкамі.

Эканамічным саветнікам галоўнакіруючага і кіраўніком Эканамічнага ўпраўлення з’яўляўся генерал Уільям Дрэйпер, адна з вядучых фігур у акупацыйнай адміністрацыі амерыканскай зоны, пасля ен стаў намеснікам старшыні назіральнага савета “Дылан, Рыд энд кампані”, буйнейшага банку, што пазычваў сродкі дзеля капітальных укладаў. Гэты банк быў вядомы сваімі трывалымі сувязямі з германскай прамысловасцю і фінансамі. Старшыня назіральнага савета Пол Ніцэ займаў рад важных дзяржаўных пасад, аж да міністэрскіх.

Кіраўніком аддзела кантролю за ўласнасцю (пры фінансавам упраўленні амерыканскай ваеннай адміністрацыі) быў прызначаны Эрл Райсель. З 1920 г. па 1942 г. ен з’яўляўся прадстаўніком амерыканскіх гандлевых інтарэсаў у Германіі, узначальваў у якасці віцэ-прэзідэнта Амерыканскую гандлевую палату ў Германіі.

Персанал для акупацыйнай адміністрацыі ЗША рыхтаваўся асабліва ўважліва і загадзя, яшчэ са снежня 1941 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З 1 студзеня 1946 г. у амерыканскай зоне адбылося абасабленне камандавання акупацыйных улад ад ваеннай адміністрацыі па грамадзянскім справам: функцыі грамадзянскай адміністрацыі адыйшлі ад камандуючых ваеннымі акругамі і былі перададзены ўпраўленням ваеннай адміністрацыі федэральных зямель. У ваеннай адміністрацыі значна ўзрасла доля пасад, займаемых грамадзянскімі асобамі.

24 чэрвеня 1946 г. кіраўнік амерыканскай акупацыйнай адміністрацыі Германіі Дж. Макнэрні паведаміў, што з 1 ліпеня 1946 г. пачынаецца фаза пераходу амерыканскай зоны ад акупацыі ваеннымі сіламі да акупацыі паліцэйскімі сіламі. У той жа заяве ўказвалася, што паліцэйскія войскі пачнуць выконваць свае абавязкі з 1 ліпеня 1946 г., а з 1 ліпеня 1947 г. амерыканская зона будзе акупавацца толькі амерыканскімі паліцэйскімі сіламі. 9 ліпеня 1946 г. Дж. Макнэрні заявіў, што "колькасць амерыканскіх акупацыйных войск у Еўропе будзе значна скарочана і да ліпеня наступнага году будзе складаць 170 тыс. чалавек (на 15 студзеня 1946 г. толькі ў Германіі іх было 622 тыс. чалавек, а на 9 ліпеня 1946 г. – больш за 300 тыс. чалавек)" [5, л. 2]. З другога боку, амерыканскае камандаванне фарсіравала стварэнне органаў самакіравання, усе ў большай спупені передавая немцам функцыі кіравання.

Адначасова ўзмацнілася прапаганда за федэральны ўклад Германіі. ЗША адмовіліся ад сваіх планаў расчлянення Германіі, матывіруя гэта перспектывай мець на сваім баку германскую дзяржаву як важкі фактар у пасляваенным размеркаванні сіл. Акрамя таго, у федэралізацыі Германіі ЗША бачылі зручную форму палітычнай і дзяржаўнай арганізацыі, якая дазволіла бы ім захаваць свой кантроль над гэтай краінай.

Стаўка ОМГУС на выкарыстанне федэраліcцкіх канцэпцый і меўшыхся ў грамадстве тэндэнцыях выявілася ў тым, што ўжо з самага пачатку акупацыі амерыканская ваенная адміністрацыя пачала ствараць самастойныя дзяржаўныя ўтварэнні ў межах традыцыйных нямецкіх зямель. Урадам зямель, што былі створаны на прыканцы 1945 – пачатку 1946 гг., былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

перададзены заканадаўчыя, судзебныя і выканаўчыя функцыі. У 1946 г. ва ўсіх трох землях амерыканскай зоны былі створаны заканадаўчыя сходы.

Тры федэральныя зямлі амерыканскай зоны – Баварыя, Грос-Гесэн і Вюртэмберг-Бадэн былі аб'яднаны ў саюз, сімвалічным прадстаўніком якога з'яўляўся Савет зямель (Лэндерат), заснаваны 5 кастрычніка 1945 г. дзеля таго, каб гэтыя правінцыі "пачалі супрацоўнічаць паміж сабою... як бы ў межах федэратыўнага кіравання" [6, с. 55].

Савет зямель складаўся з міністраў-прэзідэнтаў – Баварыі, Грос-Гесэна і Вюртэмберг-Бадэна. Рэзідэнцыя Савета знаходзілася ў Штутгарце. Паседжанні Савета праходзілі не радзей аднаго раза ў месяц. Да кампетэнтнасці Савета адносіліся: вырашэнне пытанняў, якія па сваей значнасці выходзілі за межы адной зямлі; рэгуляванне пытанняў транспарта і сувязі; забеспячэнне адзінства ў вобласці палітычнага, сацыяльнага, эканамічнага і культурнага жыцця.

Пастанаўленні Савета зямель былі абавязковымі для ўсей зоны. Савет зямель меў права ажыццяўляць знешнія зносіны з іншымі зонамі і землямі, дзеля гэтага ен мог прызначаць сваіх прадстаўнікоў, а таксама прымаць прадстаўнікоў іншых зон і зямель. Савет зямель меў апарат пад кіраўніцтвам генеральнага сакратара, прызначаемага міністрамі-прэзідэнтамі, а таксама камітэты, падкамітэты і камісіі. Сувязь з землямі падтрымлівалася праз генеральнага сакратара і ўпаўнаважанных  Савета зямель. Савет зямель меў свой бюджэт, выдаткі па якому неслі землі.

Іншым важным органам кіравання была так званая Дырэкторыя, якая складалася з сямі членаў (па два ўпаўнаважанных ад кожнай зямлі і генеральны сакратар). Дырэкторыя – орган, створаны па вырашэнню міністраў-прэзідэнтаў зямель 27 мая 1946 г. Стварэнне Дырэкторыі афіцыйна тлумачылася павелічэннем аб'ему дзейнасці Савета зямель і неабходнасцю спрасціць яго працу. У Дырэкторыю перадавалася для вырашэння асноўная маса пытанняў, з прычыны чаго яна павінна была склікаць паседжанні часцей, чым Савет зямель, а гэта значыць не радзей аднаго разу ў тыдзень [7,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

с. 616]. Адзінагалосна прынятыя рашэнні Дырэкторыі ўступалі ў сілу неадкладна і станавіліся рашэннямі Савета зямель.

Савет зямель і Дырэкторыя з'яўляліся вышэйшымі нямецкімі грамадзянскімі органамі кіравання амерыканскай акупацыйнай зоны. Мерапрыемствы, праводзімыя амерыканскімі ўладамі, вызначаліся як накіраванныя выключна на актыўную дэцэнтралізацыю Германіі і выкананне рашэнняў Патсдамскай канферэнцыі.

2 снежня 1946 г. дзяржаўным сакратаром ЗША Дж. Бірнсам і брытанскім міністрам замежных спраў Э. Бэвінам у Вашынгтоне было падпісана пагадненне аб стварэнні так званай "аб'яднанай зоны" – Бізоніі (Bi-zone) тэрмінам да 1951 г. З гэтага часу абедзьве зоны трэба было разглядаць як адзіную эканамічную цэласнасць, а да канца 1949 г. планавалася стварыць самазабяспечваючуюся эканоміку дзеля гэтай тэрыторыі [8, p. 110-113].

Да снежня 1947 г. заходнія саюзнікі ўжо вырашылі распачаць аб'яднанне амерыканскай, англійскай і французкай зон акупацыі, так званай Трызоніі. У першай палове 1948 г. былі зроблены вырашаючыя крокі ў гэтым напрамку. 7-8 студзеня 1948 г. у Фракфурце-на-Майне адбылося паседжанне міністраў-прэзідэнтаў Бізоніі, скліканае акупацыйнымі ўладамі. Было абвешчана пра неадкладныя меры, якія пераўтваралі "аб'яднаную эканамічную вобласць" у сапраўдную дзяржаву.

Як паведамляе нямецкі гісторык Х. Кісман, "тым самым была створана выява будучай канстытуцыйнай дзяржавы ў выглядзе парламента, прадстаўнікоў зямель і ўрада" [9, с. 98].

8 красавіка 1949 г. у Вашынгтоне адбылася канферэнцыя міністраў замежных спраў ЗША, Велікабрытаніі і Францыі, якая датычылася будучага лесу Заходняй Германіі. Пад час паседжання было прынята пагадненне аб зліцці трох заходніх зон і ўтварэнні Трызоніі (Trizonal Fusion) [10, p. 91].

10 красавіка 1949 г. тры ваенных губернатара перадалі немцам тэкст Акупацыйнага статута. У суправаджальнай ноце ўказвалася, што з моманту стварэння германскай Федэратыўнай Рэспублікі ваенная адміністрацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спыніць свае існаванне, а функцыі саюзных улад будуць падзелены такім чынам, што кантрольныя паўнамоцтвы будуць спалучаць Вярхоўны камісар, а ваенныя функцыі – галоўнакамандуючы. Тры  Вярхоўных камісара сумесна стварылі Саюзную вярхоўную камісію, і тры ўрада мелі намер абмежаваць да мінімума персанал штабоў пры Вярхоўных камісарах. З мэтамі забеспячэння бяспекі акупацыйныя ўлады захоўвалі за сабою наступныя правы: а) раззбраенне і дэмілітарызацыя, улічваючы звязаныя з імі вобласці навуковага даследвання, забарону і абмежаванне прамысловасці і грамадзянскі паветраны транспарт; б) кантроль над Рурам, рэсцітуцыі, рэпарацыі, дэкартэлізацыя, дыскрымінацыя ў гандлю, замежныя інтарэсы ў Германіі і прэтэнзіі да Германіі; в) замежныя справы, улічваючы міжнародныя пагадненні, заключаемыя Германіяй ад яе імя; г) знікнуўшыя без вестак пад час вайны асобы (displaced persons) і прыем бежанцаў; д) ахова, аўтарытэт і бяспека ўзброенных сіл; е) выкананне Асноўнага закону і канстытуцый зямель; ж) кантроль над знешнім гандлем і валютнымі аперацыямі; з) кантроль над знешнімі мерапрыемствамі; і) кантроль над выкананнем вынесенных у дачыненні да зняволенных асоб прысудаў [1, с. 108-109].

Хоць вышэйшыя інстанцыі канстытуіруючай Фэдэратыўнай дзяржавы яшчэ не былі складзены, Асноўны закон уступіў у сілу 23 мая 1949 г. У выніку адносіны паміж акупацыйнымі дзяржавамі і немцамі былі ўзняты на новы падмурак.

З гэтага моманту функцыі Вярхоўных камісараў з адміністратыўных пераўтварыліся ў наглядальныя; у нязменным выглядзе захоўваўся памер іх правоў і паўнамоцтваў у сферы знешніх зносін новай рэспублікі.

Такім чынам, выкарыстоўваючы сваю ваенную, эканамічную і фінансавую дапамогу, ЗША ўжо ў пачатку 1947 г. адыйшлі ад палітыкі па рэгіяналізацыі Германіі да накірунку на інтэграцыю ўсіх трох зон і стварэнне заходнегерманскай дзяржавы, якая павінна была ўваходзіць у сістэму еўрапейскай інтэграцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Літаратура і крыніцы*

1. Потсдамское соглашение. Избранные документы по германскому вопросу 1943 – 1949 гг. – Берлин: Гос. изд-во ГДР, 1971. – 133 с.
2. Balfour, M. Four power control in Germany and Austria, 1945 – 1946 / M. Balfour. – L. Praeger, 1956. – 344 p.
3. Occupation of Germany. Policy and progress, 1945 – 1947. The Department of State. – Washington: GPO, 1947. – 241 p.
4. Middleton, D. The struggle for Germany / D. Middleton. – Indianapolis: Bobbs-Merrill Co., 1949. – 304 p.
5. Архив внешней политики РФ. Ф.07. Оп. 11. П.14. Д.189.
6. Дзелепи, Э. Конрад Аденауэр: легенда и действительность / Э. Дзелепи. – М.: Идз-во ин. лит-ры, 1960. – 184 с.
7. СССР и германский вопрос. 1941 – 1949. Документы из Архива внешней политики РФ. В 2 т. – М.: Международные отношения, 2000 – Т.2. – 784 с.
8. Documents on Germany, 1944 – 1985. – Washington: United States Government Print. Office, 1985. – 1421 p.
9. Филлитов, А.М. Германский вопрос: от раскола к объединению. Новое прочтение / А.М. Филлитов. – М.: Международные отношения, 1993. – 240 с.
10. Germany 1947 – 1949. The Story in Documents. The Department of State. – Washington: United States Govt. Print. Off., 1950. – 631 p.

*Анатацыя*

*Артыкул прысвечаны агляду адміністрацыйнага апарату і органаў кіравання амерыканскай зонай акупацыі Германіі ў 1945-1949 гг. На аснове шэрага фактаў робіцца вывад аб тым, што ўжо ў пачатку 1947 г. ЗША адыйшлі ад палітыкі па рэгіяналізацыі Германіі да накірунку на інтэграцыю ўсіх трох зон і стварэнне заходнегерманскай дзяржавы, якая павінна была ўваходзіць у сістэму еўрапейскай інтэграцыі.*

*Summary*

*The article is devoted to the process of forming of American occupation administration of Germany from 1945 till 1949. On the basis of lines of factors it is judged that the USA in the beginning of 1947 passed to the course of creation the Federative Republic of Germany.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ